# САЦЫЯКУЛЬТУРНЫЯ СУПЯРЭЧНАСЦІ ЯК ФАКТАР ЗМЕНЫ КУЛЬТУРНА-ГІСТАРЫЧНЫХ ПАРАДЫГМАЎ (на прыкладзе беларускай культуры XIX ст.)

**Жылко У.А.**
*аспірантка кафедры культуралогіі*
*УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

Для пасляховага разумення прычын і характару змен сацыякультурных парадыгмаў, што назіраюцца на працягу ўсёй айчыннай гісторыі, неабходна ўважліва прааналізаваць характэрныя для пераломных момантаў гістарычнага развіцця станы сацыякультурнай непаўнаты, грамадска-гістарычнай нестабільнасці, няўстойлівасці, неадпаведнасці сацыяльных прадметаў і культурных значэнняў, што здольныя нарадзіць глыбокія і часам невырашальныя супярэчнасці. Менавіта дадзеныя сацыякультурныя супярэчнасці і выступаюць у якасці рухаючых чыннікаў культурна-гістарычнага развіцця.

Прынцыповае значэнне для разумення сацыякультурных супярэчнасцей нацыянальнай гісторыі культуры набываюць супярэчнасці паміж сацыяльнымі і культурнымі з’явамі, выпадкі неадпаведнасці паміж імі. Шматлікія з такіх сацыякультурных неадпаведнасцей узнікаюць у выніку “накладвання” адзін на аднаго двух або некалькіх гістарычных этапаў, супярэчлівага суіснавання ў часе і прасторы сацыяльных і культурных з’яваў, якія генетычна ўзыходзяць да розных перыядаў і фазаў развіцця культуры і грамадства. У той жа час маштабнасць дадзеных супярэчнасцяў можа быць і не такая значная, паколькі вышэй адзначанае суіснаванне сацыякультурных парадыгмаў можа быць дастакова непрацяглым, а значыць хутчэй заканамернай з’явай, чым рэзкай раптоўнай “ломкай” цэласнай і адзінай сацыякультурнай сістэмы (вядома, калі гэта не рэвалюцыйная змена парадыгм культурна-гістарычнага развіцця).

Безумоўна, не прыходзіцца спрачацца з тым, што на пачатку XIX ст. у гісторыі айчыннай культуры яскрава прасочваецца момант падобнага наслайвання менавіта не самаго этапа (паколькі эпоха Асветніцтва завяршылася ў XVIII ст.), а ідэйнага зместу (асветніцкія ідэі прысутнічаюць у сацыякультурным развіцці грамадства і на пачатку XIX ст.), які, тым не менш, пачынае неадпавядаць асаблівасцям сацыяльнага развіцця на дадзеным этапе. Духоўна-культурная сітуацыя на Беларусі ў пачатку XIX ст. не вельмі спрыяла развіццю класіцызму з яго ідэаламі грамадзяніна і дзяржавы, а таксама асветніцкім ідэалам розуму, які, як высветлілася, не з’яўляецца апошняй вырашаючай інстанцыяй, паколькі ўжо з канца папярэдняга стагоддзя гістарычныя і сацыяльныя варункі прывялі да заняпаду дзяржаўнасці ва ўмовах нацыянальнага прыгнёту з боку суседняй імперыі, што не магло не прывесці ў наступны перыяд да змены каштоўнасна-сэнсавых сістэм і стылёвых прынцыпаў культуры (або ў цэлым сацыякультурнай парадыгмы з асветніцкай на рамантычную).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нягледзячы на цесную сувязь з папярэдняй эпохай, ужо ў пачатку XIX ст. беларуская культура ўступіла ў новы этап свайго развіцця, што было абумоўлена прычынамі грамадска-палітычнага характару. Супярэчлівы характар сацыякультурнага развіцця беларускага грамадства XIX ст. найперш абумоўлены збегам гістарычных варункаў, які і з’яўляецца першапрычынай зменаў у культурным, палітычным і сацыяльным полі. Культура, па меркаванні вядомага даследчыка Ю.М. Лотмана, заўжды звязана з гісторыяй, заўсёды прадугледжвае бесперапыннасць маральнага, інтэлектуальнага, духоўнага жыцця чалавека і грамадства [3, с. 8]. Усім вядома, што падкрэслена адмоўны ўплыў на “душу” беларускага народа аказалі ў XIX ст. акалічнасці гісторыі, якія сваім супярэчлівым характарам не толькі спрабавалі пазбавіць беларускую культуру магчымасці для сталага фарміравання, а пасля і асновы для існавання і развіцця, але выступалі своеасаблівым стымулам у пошуках спосабаў самазахавання і фарміравання нацыянальнай самасвядомасці.

Тагачасная беларуская культура развівалася ў перыяд значных гістарычных працэсаў. У выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай, якімі вызначылася ў гісторыі мяжа XVIII–XIX стст., спыніла сваё існаванне адна з буйных дзяржаў Еўропы. Такім чынам, у сферы сацыяльна-палітычных адносін адбывалася ўмацаванне царскага абсалютысцкага рэжыму Расійскай імперыі на беларускіх землях, што адлюстроўвалася ва ўзмацненні русіфікатарскай палітыкі (русіфікацыя адміністрацыі, землеўладання, адукацыі), ліквідацыя ўніяцтва, адмена правамоцнасці Статута ВКЛ 1588 г., устанаўленні жорсткага паліцэйска-бюракратычнага кантролю ў розных сферах жыцця грамадства – такімі былі асноўныя фактары, якія вызначалі характар грамадскага жыцця. Безумоўна, акрэслены пералік сацыяльных чыннікаў не мог не ўплываць у той ці іншай ступені на сацыякультурную парадыгму таго часу. Як слушна заўважыў у свой час І. Вуглік, з пункту гледжання палітычнай, эканамічнай сітуацыі, уздзеянне геапалітычнага фактару на сацыякультуную дынаміку мела ў большай ступені негатыўны характар, паколькі было звязана з фундаментальнымі зменамі грамадскай сістэмы Беларусі – у канцы XVIII – пач XIX ст. – змены папярэдняй, у аснове сваёй еўрапейскай сістэмы на расійскую [4, с. 139]. Такім чынам, атрымліваецца, што сацыякультурная дынаміка беларускага грамадства XIX ст. абумовіла змену культурных парадыгм у сваіх межах, што было прадыктавана патрэбамі часу і супярэчлівым характарам дадзенага гістарычнага перыяду ў адносінах да беларускай культуры.

З нагоды гэтых прычын канец XVIII – пачатак XIX стст. у гісторыі культуры беларускіх земляў можна ахарактарызаваць як пераходны перыяд. Вызначальную ролю пераходных перыядаў у гісторыка-культурным працэсе неаднаразова адзначаў у сваіх працах М.С. Каган, падкрэсліваючы, што менавіта пры іх вывучэнні найбольш яскрава праяўляецца адрозненне культуры ад іншых бакоў жыцця чалавецтва [2, с. 137–138]. Сапраўды, сфера культуры, як адна з найважнейшых частак быцця ва ўсіх сваіх праявах найбольш яскрава адлюстоўвае змены эпохі. Як вядома, менавіта ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пераломныя моманты гісторыі выкрываюцца ўсе супярэчнасці сацыякультурнага развіцця грамадства, што ў сваю чаргу цалкам заканамерна прыводзіць да адкрыцця новых перспектыў і накірункаў у гэтым развіцці. Менавіта ў дадзеных умовах і нараджаецца новая рамантычная эпоха, якая здолела пазбавіцца жыццёвых і творчых канонаў, навязаных папярэднім перыядам. Тагачаснае мастацтва паставіла перад сабой выразную задачу: распрацаваць і неўзабаве ўвасобіць у культурных артэфактах тэорыю, здольную адлюстраваць увесь комплекс пытанняў існавання чалавека, прыроды, Сусвету.

Агульнапрынята лічыць выкрышталізоўванне феномена рамантызму заканамернай з’явай, звязанай найперш з інтэлектуальнай рэакцыяй на ідэалогію Асветніцтва, крытыку і адмаўленне асноўных яе палажэнняў, якія нібыта перасталі адпавядаць рэчаіснасці і спрыяць паспяховаму вырашэнню лёсавызначальных задач. У гэтым бачыцца асноўная супярэчнасць, якая паслужыла штуршком да змены сацыякультурных парадыгмаў у гісторыі айчыннай культуры. Тым не менш, у дачыненні да беларускай культуры папярэдняе сцверджанне мае сваю нацыянальную адметнасць, якая заключаюцца ў сувязі беларускага рамантызму з ідэалогіяй Асветніцтва, а таксама ў адсутнасці такога непрымірымага антаганізму рамантызму з класіцызмам як формамі ўвасаблення адпаведна рамантычнай і асветніцкай парадыгмы, паколькі класіцызм не выкрышталізаваўся ў свой час ў асобную эпоху ў развіцці беларускай культуры, а значыць не было чаго “звяргаць”, а паколькі ранні беларускі рамантызм не быў завершанай плынню ў культуры, ён спалучаў у сабе рысы шляхецкага асветніцтва, дыдактызму з характэрнай для рамантыкаў арыентацыяй на духоўныя каштоўнасці народа [1, с. 149].

У сярэдзіне стагоддзя рамантычная парадыгма сацыякультурнага развіцця беларускага грамадства паступова выцясняецца рэалістычнай. Найперш дадзеныя зрухі былі абумоўлены некаторымі зменамі ў сацыяльным і палітычным жыцці. 1850–1860-я гг. – час найвышэйшага ўздыму вызваленчай барацьбы беларусаў супраць царызму. Пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. адбываецца ўзмацненне рэпрэсіўнага рэжыму, што выявілася ва ўзмацненні паліцэйска-бюракратычнага кантролю за палітычным жыццём на тэрыторыі Беларусі, паглыбленні палітыкі русіфікацыі ў розных сферах грамадскага жыцця. У сферы духоўнага жыцця адбываліся наступныя працэсы: умацаванне пануючага статусу праваслаўнай канфесіі ў сферы рэлігійных адносін, дыскрымінацыйная палітыка ў адносінах да каталіцкага насельніцтва. У той жа часназіралася развіццё форма нелегальнай рэвалюцыйнай субкультуры (друк, літаратура). Менавіта ў дадзеных супярэчлівых гістарычных варунках выспела патрэба ў рэалістычным адлюстраванні рэчаіснасці, неабходнасці абвастрэння ўвагі да сацыяльных праблем і адпаведна крытыцы існуючых грамадска-палітычных парадкаў.

У станаўленні дадзенай культурнай парадыгмы ізноў жа прасочваюцца супярэчнасці як асноўны сродак зменаў у сацыякультурным развіцці. У якасці бадай што асноўнай супярэчнасці выступае супрацьстаянне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рамантызму з яго экзальтаванай ідэалізацыяй унутраных перажыванняў асобы, што ў сваю чаргу не надта спрыяла выкрыванню і вырашэнню ўсіх праблемных праяваў рэчаіснасці, бо не ўлічвала рэальных законаў грамадскага развіцця. Перад тагачаснымі людзьмі стала задача даследаваць жыццё з мэтай выяўлення аб'ектыўных заканамернасцей. Таму змена рамантычнай парадыгмы на рэалістычную ў беларускай культуры была цалкам прадказальнай з'явай, не гледзячы на тое, што ў той жа час рамантызм і сентыменталізм захоўваюць сваю эстэтычную дзейнасць і ў сярэдзіне, і ў другой палове XIX ст.

Такім чынам, XIX ст. у гісторыі беларускай культуры выступае як неадназначны і шматаспектны ў сваёй аснове перыяд сацыякультурнага развіцця, які характарызуюцца надзвычайнай ускладненасцю сацыяльнай і культурнай сітуацыі і ў той жа час адыгрываюць вызначальную ролю ў культуратворчым працэсе. Адметнасцю сацыякультурнага развіцця беларускага грамадства ў XIX ст. была невыразнасць, стушаванасць межаў паміж рознымі з'явамі мастацкага, ідэйнага характару: своеасаблівае суіснаванне, накладванне адзін на аднаго сацыяльных і культурных фактараў розных парадыгмальных накірункаў, адначасовае развіццё некалькіх плыняў, што найперш было абумоўлена шматлікімі сацыякультурнымі супярэчнасцямі.


1. *Дорошевич, Э.К.* Очерк истории эстетической мысли Белоруссии / Э. К. Дорошевич, В.М. Конон. – М. : Искусство, 1972. – 320 с.

2. *Каган, М.С.* Философия культуры / М.С. Каган. – СПб: Петрополис, 1996. – 415 с.

3. *Лотман, Ю.М.* Беседы о русской культуре / Ю.М. Лотман. – СПб. : Искусство – СПб, 1994. – 758 с.

4. *Углик, И.Г.* Основные факторы историко-культурной динамики Беларуси / И.Г. Углик // Наука и образование в условиях социально-экономической трансформации общества. – Мінск : Современное знание, 2010. – С. 139–141.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ